Памяць



# Герою было толькі дваццаць...

## І яшчэ адзін

**Сёлета 18 лютага 100 гадоў з дня нараджэння ўдзельніка вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, Героя Савецкага Саюза Б. С. Акрэсціна.**

Барыс Сямёнавіч — масквіч, з сям'і чыгуначнікаў. Пасля сямігодкі займаўся ў аэраклубе — асвойваў лётную справу.

З верасня 1942-га ён ваяваў на Сталінградскім, потым на чацвёртым Украінскім фронце, у складзе экіпажа начных бамбавікоў здзейсніў сотні баявых вылетаў і атрымаў свае першыя ўзнагароды. На адрас яго бацькоў камандаваннем часці быў накіраваны ліст са словамі падзякі за выхаванне сапраўднага патрыёта, які ў барацьбе з ворагам не ведае страху. Гвардыі старшаму лейтэнанту Акрэсціну было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза. Яго, маладога лётчыка, у армейскай і дывізіённай газетах, баявых лістках называлі майстрам штурмавых удараў, паветраным снайперам.

З пачаткам стратэгічнай наступальнай аперацыі «Баграціён» авіяполк, дзе ваяваў Барыс Акрэсцін, увайшоў у склад першай паветранай арміі трэцяга Беларускага фронту. Ад яго камандавання паступіў загад не даць вывезці ў Германію баявую тэхніку і нарабаваную маёмасць (вялікую колькасць



варожых эшалонаў разведка выявіла на ўчастку Орша — Талачын). Барыс Акрэсцін узначаліў групу штурмавікоў, якая змагла цалкам паралізаваць чыгуначны рух...

На пачатку ліпеня 1944-га перад эскадрыллю праслаўленага лётчыка была пастаўлена задача падтрымліваць наземныя часці, якія знішчалі фашыстаў у «Мінскім катле». Барыс Акрэсцін некалькі разоў вадзіў сваю групу на скопішчы танкаў, аўтамашын і пяхоты ворага. Падчас чарговай штурмоўкі яго самалёт быў падбіты: ахопленую агнём баявую машыну лётчык накіраваў на варожую калону — знішчыўшы пры гэтым шмат гітлераўцаў і тэхнікі.

Пасмяротна Барыс Акрэсцін быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны I ступені. Імем героя названыя адна з вуліц Ліды, вуліца, завулак і гімназія № 30 у Мінску. Там жа, у сталіцы, на Вайсковых могілках, усталяваны помнік. Герою было толькі дваццаць... І яшчэ адзін.

**Мікалай Шаўчэнка,**
*г. Мінск.*